**Литература**

1 Гофман, Э. Т. А. Сказки / Э. Т. А. Гофман. – Санкт-Петербург : СЗКЭО, 2022. – 719 с.

2 Тлевцежева, М. А. Фольклорные мотивы в духовно-эстетическом и сюжетно-композиционном содержании произведений Э. Т. А. Гофмана / М. А. Тлевцежева // Вестник Майкопского государственного технологического университета. – Майкоп : ФГБОУ ВО МГТУ. – 2009. – № 1. – С. 127–131.

3 Гете, И. Фауст / И. Гете. – Москва : Государственное издательство художественной литературы, 1960. – 322 с.



**УДК 821.161.3-311.6*І.П.Шамякін**



***К. В. Уніятава***


# АДМЕТНАСЦІ ВЫРАШЭННЯ ВАЕННАЙ ТЭМЫ Ў ПОЗНЯЙ ПРОЗЕ ІВАНА ШАМЯКІНА


*Артыкул прысвечаны вывучэнню ваеннай тэмы ў позняй прозе І. Шамякіна. Разгледжаны раман “Злая зорка”, аповесці “Ахвяры” і “Зона павышанай радыяцыі”. Зроблена выснова, што пісьменніка цікавяць падзеі Афганскай вайны і партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны, якія адлюстроўваюцца ў абраных творах праз лёсы і псіхалогію герояў.*


Для шамякінскай творчасці канца ХХ стагоддзя характэрна песімістычнае ўспрыманне рэчаіснасці. Мае рацыю даследчык С. Андранюк, калі сцвярджае: “Нават у творчасці такога ўвогуле аптымістычнага пісьменніка, як Іван Шамякін, песімістычнае ўспрыманне сучаснасці адчуваецца даволі выразна” [1, с. 17]. Да гэтых зменаў у светаразуменні прывялі трагічныя падзеі ва ўласным жыцці пісьменніка – перажыванні, звязаныя са стратай сына, смяротнай хваробай (лейкеміяй) жонкі. Але, зразумела, былі і іншыя, знешнія, прычыны. Чым жыло грамадства ў той час? Палітыка перабудовы, вайна ў Афганістане, разбурэнне СССР, чарнобыльская трагедыя, рэзкая палярызацыя грамадства, яго падзел на бедных і багатых і г. д. І. Шамякін рашуча не прымаў ні перабудову, ні распад СССР, што адбілася на яго творах 1990-х гадоў.

У масавай постсавецкай свядомасці адным з найважнейшых сімвалаў 80-х гадоў стала менавіта Афганская вайна. Яе падзеі адлюстраваны ў аповесці І. Шамякіна “Зона павышанай радыяцыі”. Сям’я Вятрэнкі жыве на Курылах у гарнізоне, бо бацька – ваенны: “Абавязкі мае, акрамя дзяжурстваў па гарнізону, не былі строга нармаваны. Сярод ракетчыкаў, сувязістаў я быў адзіны па сваёй прафесіі: афіцыйна – ваентэхнік па ахове зброі, механізмаў ад хімічных пашкоджанняў” [2, с. 15]. Павел разам з жонкай Галяй вырасцілі адзінага сына Жэню, які, нягледзячы на ўласцівыя хлопцу дабрыню, мяккасць і далікатнасць, вырашыў пайсці па слядах бацькі – паступіў у сувораўскае вучылішча ў Маскве: “Галя хацела, каб Жэня пайшоў у школу, а пасля – у медыцынскі інстытут; сама бібліятэчны работнік, Галя лічыла, што ў свеце няма больш высакароднай прафесіі, як быць лекарам, лячыць людзей. А Жэня і слухаць не хацеў пра медыцыну, крычаў: «Не хачу я клізмы ставіць! Фу, брыдота якая!» Ён трызніў іншым – ваенным вучылішчам” [2, с. 121].

Здавалася б, жыццё сям’і Вятрэнкаў наладжвалася: “Галя была на сёмым небе: дома, у Беларусі, – і такая ўладжанасць, і службовая, і бытавая” [2, с. 149]. Але кароткае пісьмо ад нявесткі стала быццам прадвесцем бяды: “Жэню пагналі ў Афганістан” [2, с. 161].




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Праз жыццёвую філасофію бацькі, Паўла Паўлавіча, І. Шамякін раскрывае ўспрыманне ваенных падзей тагачасным грамадствам: “Вобраз ворага непахісна трымаўся ў маёй свядомасці яшчэ са школьных гадоў, у акадэміі ён атрымаў тэарэтычную базу, філасофскае асэнсаванне. Амерыканцы – галоўны вораг. А ворагу нельга саступаць ні ў чым. Ворага трэба біць. Хіба не для гэтага я так доўга і настойліва асвойваў сакрэтную зброю – хімічную, ядзерную і метады абароны ад яе? Хіба не для змагання з ворагам прайшоў два вучылішчы Жэня? Раз так зарыентаваў яго, так вучыў, то не раскісай, падпалкоўнік, мужна (але, мужна!) пераносі любыя павароты ў сваёй і сынавай службе!” [2, с. 161].

Разам тым у свядомасці героя ўпершыню ўзніклі іншыя пытанні, якія парушылі яго, здавалася б, непахісныя перакананні. Дзеля чаго Жэню пагналі? Навошта? Забіваць такіх жа маладых афганцаў? Бацька добра ўсведамляў, што дапамагчы сыну нічым не можа, але, павагаўшыся, вырашыў паехаць у Афганістан. Атрымаўшы пісьмо ад Жэні, Павел Вятрэнка адчуў душэўны надрыў сына. Праводзіўшы мужа, Галя не праранiла ніводнай слязінкі, на дзіва была спакойная, быццам муж яе едзе не на вайну, а на курорт. Сказала: “Пацалуй там Жэню ад мяне. І Люду, калі ўбачыш яе ў Ташкенце” [2, с. 163].

Жэнеў полк знаходзіўся на поўначы на перавале Саланг, дзе ішлі жорсткія бai з маджахедамі. Даволі трывожная сцэна сустрэчы бацькі з сынам апісваецца ў творы: “– Бацька! Ты? І ты тут? Плечы яго ўздрыгвалі. Я чамусьці спалохаўся, што ён плача тут, перад сваім палкоўнікам. Хоць што ганебнага ў такой слабасці – нечакана сустрэць бацьку ля падножжа Гіндукуша?” [2, с. 170]. Не менш паказальны і той факт, што Жэня шмат піў – куляў чарку за чаркай. Бацька зрабіў яму заўвагу, але пачуў у свой адрас: “Бацька! Тут нельга не піць. Праедзеш, інжынер, па часцях, то ўбачыш, ад чаго людзі п’юць. Ад таго, што не бачаць канца гэтай праклятай вайне. Кажуць, у амерыканцаў з’явілася новая хвароба – “в’етнамскі сіндром”. Будзе ён і ў нас – афганскі” [2, с. 171].

Урэшце адбылася трагедыя: бацька даведваецца, што яго адзіны сын загінуў: “Камандуючы паклікаў мяне позна ўвечары. І хоць усе штабісты працавалі вечарамі, мяне выклік спалохаў. Я не пайшоў следам за веставым, збіраўся з духам. Хоць пра самае горшае не думаў. Увайшоў у кабінет і ўбачыў Кошалева. Генерал і палкоўнік падняліся, як толькі я з’явіўся. І я ўсё зразумеў. Прашаптаў: – Жэня?! І ў сэрцы маім разарвалася граната. Я прытуліўся да касяка дзвярэй і, пэўна, моцна збялеў” [2, с. 175]. Нягледзячы на тое, што цэнтральнай праблемай аповесці “Зона павышанай радыяцыі” з’яўляецца Чарнобыльская трагедыя, кульмінацыяй твора становіцца страшнае падарожжа бацькі побач з целам сына ў цынкавай труне.

У прысвечаным наступствам аварыі ў Чарнобыле рамане “Злая зорка” таксама адлюстраваны падзеі Афганскай вайны. Барыс, сын Пыльчанкі, служыць афіцэрам у Афганістане. Пра характар і паводзіны Барыса ведала ўсё начальства: “Ніводная твая паездка ў Кутаісі, у Сухумі не канчалася без скандалу. Залезці ў дзявочы інтэрнат на чацвёрты паверх па трубе! Звесці з пляжа чужую жонку… На вяселле брата паехаў і там чорт ведае што натварыў” [3, с. 222]. Уменне сына ўвязвацца ў непрыемныя сітуацыі хвалявала бацьку. Трывога Уладзіміра Пыльчанкі ўзмацнілася пасля слоў Тамары, нявесты Барыса, якая лятала ў Кутаісі і Барыса там не знайшла, бо ён быў на заданні. Бацька суцяшаў Тамару, як малое дзіцё, хоць у самога сэрца скаланулася: “Супакойся. Барыс – вопытны лётчык. У душманаў няма самалётаў. Там няма паветраных баёў” [3, с. 257].

Аднак цуду не адбылося, апошні баявы вылет для Барыса скончыўся трагічна: ён загінуў, але не ад удару самалёта аб зямлю, бо паспеў катапульціравацца, а ад куль ворага: “Іх стаяла двое, воддаль адзін ад аднаго, усё роўна як узялі яго ў вілку. У цывільным. Барадатыя. У белых чалмах. З аўтаматамі на грудзях. Маджахеды ўзнялі аўтаматы… Уладзімір Паўлавіч узняў над сабою сціснутыя кулакі: – Стаіш? Свеціш? Паліш людзей? Спалі мяне! Не можаш? Не па зубах я табе? Скура ў мяне задубянелая! Свінцовая! Чуеш? У мяне свінцовая скура стала!” [3, с. 305]. Адчуваючы блізкую смерць,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

герой звяртаецца за дапамогай не да людзей, бо вораг перастае ўспрымацца чалавекам, а да зямлі: “<…> павольна апусціўся на калені, ударыў кулакамі ў зямлю, крыкнуў ёй: – А ты чаму анямела, сціхла? Уздрыганіся!” [3, с. 305].

Падкрэсленым крытычна-аналітычным зместам вылучаецца рэалістычная аповесць І. Шамякіна “Ахвяры”, напісаная пісьменнікам у 1990-м годзе. Аўтар зноў засяроджваецца на ваеннай праблематыцы, але ўжо ў іншы часавы перыяд. Гэта аповесць пра партызанскі рух і “асобыя” атрады ў час Вялікай Айчыннай вайны. Тэма ўвогуле не новая ў беларускай літаратуры. Раней яе закраналі В. Быкаў у аповесцях “Мёртвым не баліць” і “Праклятая вышыня”, А Адамовіч у дылогіі “Партызаны”. Аповесць І. Шамякіна адметная тым, што пісьменнік імкнецца даследаваць у ёй не столькі саму гэту злачынную з’яву, колькі яе псіхалогію.

У “Ахвярах” пісьменнік паказвае, як партызанскі рух імкнуліся кантраляваць, падпарадкоўваць сабе органы бяспекі, што прадстаўлялі ведамства Берыі. З гэтага ведамства – маёр Золатаў, які зачышчае партызанскі рух ад, на яго думку, падазроных, “ад маладушных… ад такіх вось, што разлагаюцца зажыва і атручваюць атмасферу” [4, с. 152]. Галоўная задача Золатава была не столькі збіраць разведдадзеныя, колькі “партызан браць пад свой кантроль, каб не забываліся, што існуюць органы дзяржбяспекі” [4, с. 16].

Золатаў з’явіўся ў атрадзе нечакана, але атрад яго не прыняў. Яго вобраз выпісаны аўтарам у псіхалагічным плане дасканала. Як і быкаўскі Сахно (“Мёртвым не баліць”), маёр – жорсткі прагматык і прыстасаванец. Золатаў нікому не давяраў, “ні арыштаванаму, ні начальніку, ні сябру, ні жонцы, да ўсіх ставіўся з падазронасцю” [4, с. 72]. Але, спакойна забіваючы іншых, занадта дбаў аб сваім жыцці. Галоўнае для яго – выслужыцца. І самае страшнае, што гэты чалавек шчыра верыў, што яго роля ў дзяржаве адна з галоўных: спачатку ён забівае хворага начальніка штаба Брагінскага, пасля расстрэльвае падпольшчыка Шабовіча. І ўсё гэта, цынічна заяўляе маёр, “не дзеля ўласнага выратавання. Для перамогі…” [4, с. 152].

Камандзір партызанскага атрада Ман бунтуе толькі ўнутрана, знешне ён падпарадкоўваецца Золатаву, бо з’яўляецца прадуктам свайго часу. Аўтар адзначае, што ў Аляксея Іванавіча Мана “заўсёды была пэўнасць у адносінах да людзей, ва ўсялякім разе памыляўся ён рэдка ў ацэнках сваіх” [4, с. 14]. Ман спачатку не бачыць у абліччы Золатава ворага, злачынца, для яго ён усяго толькі хворы чалавек, якога трэба баяцца. “Урэшце, чорт з ім, які ён чалавек, важна, што ён свій” [4, с. 144], – супакойвае сябе Ман. У такім падманным, знешнім заспакаенні і заключаецца найбольшая трагедыя народа. Супакойваючы сябе, чалавек станавіўся суназіральнікам, даваў магчымасць сістэме твАрыць масавыя злачынствы. Адсюль і назва аповесці: ахвярамі Золатава сталі не толькі Брагінскі і Шабовіч, ахвярай з’яўляецца ўсё грамадства. Трагічнае гучанне аповесці “Ахвяры”, тым не менш, не адмяняе ідэі сцвярджэння І. Шамякіным гуманізму сацыялістычнага ладу жыцця, чым яго проза 1990-х гадоў канцэптуальна адрозніваецца ад творчасці многіх іншых пісьменнікаў.

Такім чынам, І. Шамякін у аповесці “Зона павышанай радыяцыі” і рамане “Злая зорка” ўздымае сур’ёзную грамадскую праблему вайны ў Афганістане, якая вырашаецца праз паказ прыватнай бяды і перажыванняў канкрэтнага чалавека. У прысвечанай падзеям Вялікай Айчыннай вайны аповесці “Ахвяры” пісьменнік таксама паглыбляецца ў лёсы і псіхалогію герояў, што дазваляе яму глыбока раскрыць прычыны і абставіны грамадскіх трагедый і маральна-этычныя праблемы часу.

**Літаратура**


1 Андраюк, С. Проза / С. Андраюк // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – Т. 4, кн. 2 : 1986–2000. – С. 8–39.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2 Шамякін, І. П. Збор твораў: у 23 т. / Іван Шамякін; падрыхт. тэкстаў і камент. Н. Гальго, В. Назарава, А. Шамякінай; паслясл. Л. Дуктавай; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 2011. – Т. 7 : Аповесці 1996–1998. – 503 с.

3 Шамякін, І. П. Збор твораў: у 23 т. / Іван Шамякін; падрыхт. тэкстаў і камент. А. Васілевіч, Н. Дзенісюк; паслясл. М. Караткова; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 2014. – Т. 19 : Злая зорка : раман / рэд. тома: Н. В. Гальго, М. М. Караткоў. – 2014. – 404 с.

4 Шамякін, І. П. Збор твораў: у 23 т. / Іван Шамякін; падрыхт. тэкстаў і камент. А. Шамякінай; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 2011. – Т. 5 : аповесці 1988–1993 / рэд. тома: Т. С. Голуб, А. М. Макарэвіч. – 622 с.

**УДК 821.161.3-14*Я.Янішчыц**

***А. М. Фелькіна***

## АСНОЎНЫЯ ВОБРАЗЫ ІНТЫМНАЙ ЛІРЫКІ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

*Артыкул прысвечаны даследаванню асноўных вобразаў інтымнай лірыкі Я. Янішчыц. Увага звернута на вобразы, якія часцей сустракаюцца ў вершах паэткі, даецца іх характарыстыка. Даводзіцца, што Я. Янішчыц у розныя перыяды сваёй творчасці выбірае ў якасці ключавых пэўныя вобразы, якія дапамагаюць больш дакладна ўявіць асобу аўтаркі, зразумець яе пачуцці, настрой у дадзены момант жыцця.*

Для таго, каб вызначыць асноўныя вобразы інтымнай лірыкі Яўгеніі Янішчыц, неабходна разабрацца, якое значэнне мае тэрмін “вобраз” у літаратуры. Мастацкі вобраз – гэта любая з’ява, абагульненая і творча адноўленая пісьменнікам у прадмеце мастацтва. Ён зразумелы і адкрыты для ўспрымання і здольны выклікаць глыбокія эмацыйныя перажыванні. Яркі вобраз у літаратуры ствараецца яшчэ і дзякуючы таму, што аўтар адчувае поўную свабоду творчасці, калі перад ім адкрываюцца бязмежныя далі мастацкай выдумкі і мноства спосабаў яго выражэння, з дапамогай якіх пісьменнік стварае свой твор. Вобраз з’яўляецца адлюстраваннем рэальнага жыцця, бо творцу ўласціва думаць вобразамі і ўспрымаць свет як ланцуг вобразаў [1, с. 42].

У творчасці Я. Янішчыц можна заўважыць мноства матываў і вобразаў. Напрыклад, у вершах паэтэсы часта сустракаюцца і супрацьпастаўляюцца вобразы пораў года: зімы, вясны, – і гэта нездарма так. Настрой чалавека цалкам ці часткова залежыць ад пары года. Зіма – значыць холад, завеі, спустошанасць, таму яна палохае сэрца лірычнай гераіні Я. Янішчыц, выклікае ў яе сэрцы шмат негатыўных эмоцый, нават страх. Зімовы холад – сімвал адчужанасці і расстання:

Каторы год між нас – зіма,
Ляцяць гады, як завірухі [2].

А сімвалам чаго тады з’яўляецца вясна? А вясна – значыць шчасце, росквіт не толькі прыроды, але і чалавечай душы. Гэта той час, калі ярка свеціць сонейка, цвітуць пралескі, спяваюць птушкі, жыццё і сэрца напаўняюцца светлымі і чыстымі пачуццямі, а таксама каханнем:

І дождж, і гром, і несціханы вецер,
І першы клейкі лісцік выразны!
Абуджваюць балючае дасвецце
Кахання сад і ластаўка вясны [2].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ